

# «ПАРУСІЯ»

*Парусія – з грэцкай мовы – Другое прыйсце Гасподняе, якое павінна адбыцца пры сканчэнні веку, калі князь гэтага свету раптоўна набудзе вялікую моц і статус, так што ніхто не зможа без яго загаду ці кляйна: «ні купляць, ні прадаваць» [Адкр 13, 18]. Нават многія верныя будуць пераможаныя гэтым злом, упэўненыя ў Антыхрысце як у божым сыне.

**• Рубрыку вядзе святар Яўген Маліноўскі, кандыдат псіхалагічных навук, дацэнт**

> Прызначэнне - мужчыны – Быць. Прызначэнне жанчыны – захаваць таго, хто Ёсць, для наступных пакаленняў. Калі жанчына не мае мужчыны, які Ёсць, яна абірае паміж захавацца і Быць самой.
>
> Мікалай Статкевіч "Этыка вольных".

На мінулым тыдні ў нашым горадзе і ў свеце адбылася падзея, якую яшчэ дзесяць год таму немагчыма было нават уявіць: першы выпуск аддзялення псіхалогіі універсітэта. 18 дзяўчат і 4 юнакі абралі і здолелі засвоіць курс адной з самых цяжкіх і адказных прафесій: захоўваць Слова і Быць. Псіхалогія не робіць чалавека шчаслівым, яна толькі ўладкоўвае яго ўяўленні, эмоцыі і ўчынкі адносна выбару шляхетнага жыцця. Кожны шлях характэрны пячаццю альбо кляймом. Успрыманне таго і другога вельмі суб'ектыўна. І ўсё ж тая псіхалогія, на якой пячаць свабоды, робіцца надзейнай зброяй дасягнення шчасця як ш-(с)-часці Бога слова: "спазнаеце праўду і праўда зробіць вас свабоднымі"[Ян 8, 32]. Таму калі на банкеце я звярнуўся да выпускнікоў як да мужчын і жанчын, яны адрэагавалі вельмі станоўча.

Некалі адна з выпускніц гэтага курса Алёна Шуст запісала ў сваім псіхалагічным абследаванні: "хачу слова". Дзіўнае жаданне ў параўнанні з большай часткай рэспандэнтаў, якія хочуць замуж, альбо добрай працы, альбо прыгожа жыць. Наогул, як можна хацець слова? Гэта ж не ежа і не пітво, і не дах над галавой. Але вось чалавек такая істота, што мае патрэбу быцця ў самым сабе. Таму ён схільны да слова, у якім адчувае адбітак асабістага шчасця. Прарок Амос у 8 стагоддзі да РХ пісаў: "не голадам хлеба, не прагаю вады паражу іх, але прагаю слухання словаў Гасподніх"[Ам 8, 11]. Без гэтай прагі чалавек губляе сваю асабістасць. Мужчына без асабістасці, без таго, што ён Ёсць, змяняе чын мужа на стан раба. Ведаю прафесара псіхалогіі, які пасіху співаецца. Другі прафесар стаў ідэалагічнай зброяй у абойме наменклатуры. І той і другі вераць, але вера іх, так бы мовіць, храмавая, рытуальная, падсвечаная лампадай, але не асвечаная Словам. Між тым слова "прафесар" паходзіць ад лацінскага тэрміна professus sum, eri, гучна прамаўляць, адкрыта аб'яўляць, прарочыць. Таму кожны прафесар павінен памятаць небяспеку, па якой "ні які прарок не прымаецца на сваёй бацькаўшчыне"[Лк 4, 24]. Каму шмат даецца, ад таго шмат і патрабуецца.

Псіхалогіі шмат даецца, бо яна паходзіць ад душы, psyche і слова, logos, таго самага, якое "было спачатку, стала плоццю і засялілася ў нас поўнае ласкі і праўды "[Ян 1, 14]. Таму вучэнне бяздушнае, бязбожнае, мёртвае зачыняе вусны самой псіхалогіі, якая ператвараецца ў сродак імітацыі жыцця, яе сімуляцыі і эякуляцыі... Чалавек абмежаваў слова Божае мудрагелістай вучэльняй, таму, выконваючы ленінскі лозунг "учиться, учиться и учиться", сам аніяк не можа дасягнуць пэўнай свабоды. Замяніўшы "праўду забабонамі"[2 Цім 4, 4], называючы сябе богам, ён трапна захоўвае сваю душу ад майдана незалежнасці, каб страціць яе ў геніталіях непрытомнасці. Таму сучасная адукацыя ператварылася ў падабенства змея пазнання, які, прываблiваючы дзяўчат і юнакоў заклікам "і будзеце як багі"[Быц 3, 4], выхоплівае найбольш здольных, каб паставіць іх на бездакорнае служэнне "ворагу свайму ў голадзе і празе, і галізне"[Другазаконне 28, 48].

Чалавек не міне змея спакусы, змея пазнання, ад якога, паводле Эклезіяста, "шмат скрухі", але слова евангельскае кажа "будзьце мудрыя як змеі і простыя як галубы"[Мц 10, 16]. Тут уся псіхалогія: вучыся, слухай усіх і дакранайся усяго, але май дасканалы досвед аб адным, тым, каго любіш, каму жадаеш шчасця і славы, дзеля якога гатовы ўкрыжаваць уласнае цела. Мужчына мусіць адшукаць сваю царкву, сваю палову, сваю кроў, сваю адзіную радасць, якую ніхто і ніпто не адхіне, з якою разам пакутаваць і святкаваць, і быць. Калі такога шукальніка няма, жанчына дарэмна траціць сілы на быт, у якім няма быцця. Але ведай, жанчына, што слова, якога ты хочаш, слова Любоў існуе ў самой цябе паводле шлюбу як ш-с-любу з Госпадам. Таму не марнуй шлюбу з мужчынам, страціўшым чын мужа. Слова, якога ты хочаш, сталася тваім мужам і тваім чынам, бо яно частка цябе, а ты частка Бога. Малюся, каб Быць табе, Псіхолаг-2006, Быць, каб захаваць слова.

Мать говорит Христу:  
– Ты мой сын или мой  
Бог? Ты прибит к кресту,  
Как я пойду домой?  
Как ступлю на порог,  
Не узнав, не решив:  
Ты мой сын или Бог?  
То есть мертв или жив?  
Он говорит в ответ:  
– Мертвый или живой,  
Разницы нет, жено, нет  
Сын или Бог, я твой.

И. БРОДСКИЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ